# Багуміл Грабал
# Боскім замілаваны

*

Боскім замілаваны,
па пустках туляўся й бразгаў
у пальцах бубновай панны
бубенчык блазнаў

## З ЦЫКЛЮ «ЎДЗЕНЬ»

### Дарога

Адзіным сьвятлом на шляху патаемным
празь дзікі гушчар непраходны
я бачу адсюль зорку над Бэтлеемам,
трымаюся ейнай паходні.

І, нібы цары, што калісь у вандроўку
пайшлі, каб учціць сына Бога,
мо ўгледжу капешку саломы й кароўку,
і восьліка зь ёю малога.

### Шпацыр

Рука ў руцэ ўвесь час, мы
ішлі ў палі, за места;
нам ветрык блытаў пасмы,
я зваў цябе — нявеста,

хоць вуснам было ня трэба,
сябе выказваць у слове.
Блакітам вабіла неба,
бы келіх у дарасхове...

Уночы, п'яныя зьведаным,
вяртаемся шляхам затоеным,
— Што будзе, — пытаеш, — за гэта нам?
І шэптам: — Што будзе за тое нам?

**Багуміл Грабал** — легенда чэскай літаратуры. Нарадзіўся ў 1914 г., выкінуўся з вакна бальніцы ў 1997 г. У сваёй творчасьці натуралістычную прагу да паталягаанатамізму злучыў з рамантычнай верай у сонца і прыгажосьць.

## Чайкі

Белыя крылы крыжам раскрытыя, і ад крыку ўздрыгваюць у люстэрку
адбіткі. Чорна–белыя камізэлькі, што ў глыбінях палююць свой цень.
Як кожная чорнай дзюбай ля паверхні вады шукае свайго ж пацалунку!
Каб мець мне чароўную хварасьцінку, яны б засторглі на месцы,
бы ў цернях шыпшыны, ператварыўшыся
ў архідэі, агромністыя паветраныя архідэі, іх крылы
запалалі б сьвятлом уваччу. Потым я ізноў аднавіў бы
іхныя жыцьці, крыкі, варажэйнае віраваньне па–над вірамі.
Я ясна бачу ўсё гэта. Нават згадваю адну падрабязнасьць,
быццам я зьняў зь неба чайку, што бутэльку з паліцы, дапаў яе ротам
і наталіў ейнай рэдкаснай прахалодаю смагу.
Пасьля ўзмахнуў, як крылом, далоньню, і чорна–белае пер'е
ўзьнеслася да вышыняў.

## Апоўдні

Апоўдні ў нядзелю: самая сьпёка, твары аж зьзяюць,
сьвяточныя строі.
Вулак і вуліцаў цёк паглынае рака ўсенароднага шпацыру. Ёсьць
нават прывабнае нешта ў простым ладзе жыцьця,
само сабой пэўнага, самаўпэўненага, радасьць у ланцужку
на акруглым чэраве. Якая туга апаноўвае мной
па малым гарадку, па садочку, па картах, па піве,
й пад піва бязглуздай гамонцы. Ці выйсьці
нарэшце і мне, сьвяткаваць што заўгодна і піць абы што, а як прыйдзе
час — разьлічыцца й пайсьці, апынуўшыся зноўку з усімі?
Мабыць, Плятону й Канту кранты, калі звонку разявіла ляпу
паўднёвае сонца.

## Шчасьце

Ты плачаш, маленькая? Плач, хаця
валасы набрынялі пакутаю сьлёзнай,
гэта чыстыя сьлёзы, маё дзіця,
яны знакам душы прыгожай і ўзьнёслай.

Усё, што вялікае, зь іх цячэ,
і ты вырасьцеш двойчы вялікай калісьці,
бо сьлязінка бяжыць па тваёй шчацэ
сарамліва, нібыта жучок па лісьці.

## Рамонкі

Увесь дзень наперагонкі
выстаўляюцца рамонкі:

зь белых вейкаў жоўтым вокам
сочаць сонца крок за крокам.

Гамуз, лямант на лужку:
мы з табою на таржку,

трр, мой косю. Гэй, юнача!
Мае кветкі сны тлумачаць:

па пялёстку абскубай
са сьцябла, ды ўніз кідай,

калі лісьцік долу дойдзе,
наш хлапец нявесту знойдзе.

## Жабрачка

Менавіта ў тую сэкунду, у міг азарэньня, што ў жыцці сваім кожны
пералічыць на пальцах, яна ўзважыла ўсё ў сваім лёсе, упершыню
ўсю яго шматпакутнасьць убачыўшы цалкам, ад дзявоцтва
да цяперашняй купкі касьцей. Навошта зь ёй гэта ўсё адбылося?
Ї ў сьмерці ня знойдзеш спакою, ня знойдзеш ні крыхі цяпла,
па якім людзкі смутак найбольшы.
Ї гэтак сядзела яна пры дарозе. Па зморшчаным твары, падобным да мапы
гарыстага ўсходу, каціліся пацеркі сьлёзаў, адзіных сябровак
яе маладосьці.

## Лістапад

З–за шумных куліс пералеска
зьяўляецца. З твару сплылі
пацёкамі колеры фрэскаў
часу тэмпэрнай цеплыні.
Скуголяць прыцемкі. Дол халодны.
Дождж і Славіцкавы палотны
аздабляюць плямамі пляцы.
Гразнуць боты
і стынуць пальцы.

## Восень

Твой пагляд паглынулі фужэра глыбіні —
сёньня вечарам сумна маёй Калямбіне.

Нібы мор, вокамгненна,
духам злым апантана,
ахапіла геена
шаты платана,

бы віна таго кроплі на кожнай галіне —
сёньня вечарам сумна маёй Калямбіне.

Вунь абое рабое
жарабяты па пожнях
цягнуць прэч за сабою
фарбы лісьцяў апошніх,

бы фурманка па зьвілістай мкне каляіне —
сёньня вечарам сумна маёй Калямбіне.

Як пахмельная скруха
авалодала ўсімі,
апускаецца скрутак
па вяровачцы зь сіні, —

зноў налі, можа водар напоя любімы
рады дасьць несуцешным сьлязам Калямбіны.

*Пераклаў з чэскай Максім Шчур з удзелам Андрэя Хадановіча.*